# АДЛЮСТРАВАННЕ КАСМАГАНІЧНЫХ І КАСМАЛАГІЧНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў СІМВОЛІЦЫ АБ'ЕКТАЎ РЭЧАВАГА СВЕТУ

***Я.Ю. Ленсу***, *кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык кафедры дызайну Мінскага інстытута кіравання*

Адной з асноўных складаючых светапогляду людзей усіх эпох і народаў з'яўляліся іх касмаганічныя і касмагалагічныя ўяўленні, г.зн. погляды на стварэнне і пабудову сусвету. З часоў глыбокай старажытнасці мысліцелі імкнуліся спасцігнуць прыроду светабудовы, высоўвалі розныя тэорыі ўпарадкавання свету. Але апераджаючы навуковыя гіпотэзы, а пазней і паралельна з імі існавалі таксама міфалагічныя і звязаныя з імі народныя фальклорныя ўяўленні аб светабудове. Гэтыя ўяўленні адлюстроўваліся ў вусна-паэтычнай творчасці народаў, у фальклорных эпічных творах.

Акрамя фальклору, народныя касмалагічныя і касмаганічныя ўяўленні адлюстроўваліся ў сімволіцы рэчавага свету. У першую чаргу адзначым, што ў свядомасці шмат якіх народаў менавіта сістэма поглядаў на пабудову сусвету вызначала сімволіку пабудовы жытла. Расійскі даследчык акадэмік Б. Рыбакоў, гаворачы аб сімволіцы народнага жытла, адзначае, што, адчуваючы сябе часткай светабудовы, чалавек здаўна ствараў побач з сабою як бы мадэль пазнанага ім свету, у сваім штодзённым мікракосме адлюстроўваў увесь макракосм, свядома з магічнымі мэтамі далучаючы сябе да светабудовы [1, с.30]. Сапраўды, у старажытнасці ў нашых продкаў складваецца ўяўленне аб пабудове хаты як пэўнай сімвалічнай мадэлі сусвету. Гэтая мадэль сфарміравалася яшчэ ў часы язычніцтва, калі ва ўсходнеславянскай хаце існаваў адзін сакральны цэнтр – печ, які сімвалізаваў сабою агонь нябесны, жыватворнае сонца. Але з прыняццем хрысціянства ў нашых продкаў з'яўляецца ў хаце іншы сакральны цэнтр – чырвоны кут, ці покуць. Ён набывае найбольшае значэнне ў рытуальнай сістэме жыцця сялянскай хаты, робіцца найбольш каштоўнай яе часткай у сімвалічным, абрадавым сэнсе. У гэтым куце знаходзяцца абразы, малельныя кнігі, свянцоныя свечкі. Удзельнічаючы ў складанні дыяганалі "покуць-печ", якая з'яўлялася стрыжнёвай у арыентацыі хаты ў прасторы сусвету, чырвоны кут, зразумела ж, атрымліваў вялікую семіятычную і семантычную значнасць. З покуццю звязвалася ў хаце ўсё светлае, добрае. Такім чынам, покуць, другі па храналогіі сакральны цэнтр хаты, як і яе храналагічна першы цэнтр – печ, атрымлівае сэнс святла, сонца, але не ў паганскім разуменні як свяшчэннага агню, а як увасабленне божага святла.

У той жа час калі на першы план у свядомасці нашых продкаў у хаце выходзіць новы сакральны цэнтр – покуць, стары цэнтр – печ – працягвае таксама выконваць свае сакральныя функцыі. Так, нават да пачатку XX стагоддзя ў пэўных беларускіх народных абрадах, звязаных з печчу, праяўляліся адгалоскі старажытнага паганскага культу нябеснага агню. Напрыклад, на масляныя дзяды з раніцы з рытуальнай мэтай у хаце звычайна распальвалі печ. Масленіца была святам нябеснага агню, павароту сонца на лета, таму ў яе гонар запальваўся і агонь зямны, агонь у печы.

Аднак стары сакральны цэнтр хаты – печ, у адрозненне ад хрысціянскага цэнтра – покуці, стаў успрыймацца як "паганскі". У час жа пераходу ад адной рэлігіі да другой, як вядома, паганскія свяшчэнныя атрыбуты хрысціянамі сталі надзяляцца адмоўнымі характарыстыкамі. Таму і печ як цэнтр "паганскі" ў свядомасці нашых продкаў таксама набыла шэраг адмоўных якасцяў. Яна стала ўвасабляць нешта таямнічае, цёмнае, падчас нават жудаснае. Яна ўспрыймаецца ўжо не як сакральны сімвал нябеснага агню, сонца, але агню наогул, які нясе не толькі жыватворны пачатак, але часам з'яўляецца згубнай сілай, прычынай знішчальных пажараў.

З адмовай ад язычніцтва з яго сонцапаклонствам у нашых продкаў паступова змяняецца і ўяўленне аб сакральным цэнтры сусвету. Да сонца застаюцца вельмі пачцівыя адносіны, яно вельмі важнае для чалавека, бо грэе зямлю, дае жыццё раслінам. Але як пачатак усяго, як маці жыцця цяпер пачынае разглядацца ўжо зямля. У гэтым плане характэрна сцвярджэнне беларускіх сялян, запісанае ў канцы XIX стагоддзя А.К. Сержпутоўскім: "Зямля адна на свеце, яна наша матка, бо ўсе мы ад яе радзіліся, усіх яна й прыме, як мы памром" [2, с.47]. Менавіта зямлю цяпер нашы продкі ўспрымаюць як цэнтр сусвету. У пацвярджэнне гэтага зноў звернемся да запісаў Сержпутоўскага з вуснаў беларускіх сялян: "Зямля стаіць пасярод свету, а сонейка й месяц ходзяць кругом да свяцяць, як ім Бог вялеў".

У сувязі з адбыўшыміся зменамі ва ўяўленнях аб структуры сусвету адбываюцца змены і ў сімвалічнай мадэлі светабудовы, у якасці якой выступаюць сялянская хата і яе рэчавы свет. У старой мадэлі цэнтрам было сонца, якое ў хаце, як мы памятаем, сімвалізавала печ, а вакол будаваўся астатні свет: зямля – падлога, неба – столь, завоблачная сфера – гарышча. Гэтая сістэма па традыцыі працягвала існаваць, але паралельна з ёю зараджалася і іншая сістэма, якая арыентавалася на новы сакральны цэнтр хаты – на покуць. Хоць, як мы ўжо казалі, покуць – гэта таксама святло, сонца, але не як паганскі сімвал нябеснага агню, а як увасабленне божага святла ў хрысціянскім разуменні. Гэтае ж божае святло, якое ідзе з неба, ахінае зямлю як крыніцу жыцця, як асноўны цэнтр сусвету. І калі ў хаце божае нябеснае святло сімвалізуе покуць, то ролю зямлі як цэнтра сусвету і яго сімвалічнай мадэлі, якую ў разуменні нашых продкаў уяўляла хата, пачынае адыгрываць асноўны аб'ект абсталявання жытла, які знаходзіцца ў чырвоным куце, – стол. І як вакол Зямлі ва ўяўленні людзей мінулага ідзе бег планет і свяціл, так вакол стала абарочваецца ўсё жыццё сям'і ў хаце. Пацвердзіць гэта можна наступнымі доказамі.

У шэрагу беларускіх народных абрадаў можна выявіць збліжэнне стала з вобразам зямлі. Так, на Каляды, калі стол накрываўся абрусам, пад абрус клалі слой саломы ці сена, што, як лічылі, павінна было паспрыяць добраму ўраджаю ў будучым годзе. Характэрна, што і падлога ў беларусаў у пэўныя святы засцілалася сенам. Знаходжанне ж сушанай травы на падлозе адлюстроўвала сімвалічнае атоесамленне апошняй ва ўяўленні беларускіх сялян у мінулым з зямлёй, урадлівай глебай. Зыходзячы з гэтага можна зрабіць выснову, што і стол у названым абрадзе таксама сімвалізаваў зямлю. Нагадаем, што на Каляды ў чырвоным куце над сталом вешаўся саламяны "павук" – вобраз жыватворнага сонца. Знаходжанне гэтага салярнага сімвала над сталом ізноў жа падкрэслівае збліжэнне апошняга з вобразам зямлі.

Сімвалізуючы зямлю, якая дае селяніну-хлебаробу дабрабыт і шчасце, стол набываў сакральнае значэнне яшчэ таму, што ён знаходзіўся ў самым пачэсным месцы дома – у чырвоным куце. Акрамя таго, чырвоны кут сімвалічна ўказваў на ўсход, на святло, на божую старану, таму і стол набываў сімвалічнае значэнне. Ва ўсведамленні народа нават існавала аналогія: стол у хаце – алтар у царкве. У сімволіцы стала прасочваецца яго сувязь з небам, з вышэйшымі сіламі дабра. Таму шмат у якіх народных абрадах стол набывае значэнне, блізкае да такога сімвалічнага прадмета, як царкоўны аналой. Вакол стала, як вакол аналоя ў царкве, рабіліся рытуальныя дзеянні ў час сямейных урачыстасцяў.

У час вяселля, калі быў гатовы рытуальны каравай, маладую прыводзілі ў хату, і яна, атрымаўшы благаславенне бацькоў, са сватам тры

разы абыходзіла вакол стала. "Абыйдзі, Ганулька, вакол стала / А ўпадзі мцёнцы на белыя ножкі..," – пелася ў беларускай вясельнай песні [3, с.99]. Таксама і малады ў час абраду спросін павінен быў услед за сватам тры разы абыйсці стол. Падобны абрад не раз яшчэ паўтараўся за час вяселля. Трэба сказаць, што рытуальнае абыходжанне вакол стала (звычайна тры разы) ў беларусаў было наогул вельмі распаўсюджаным абрадавым дзеяннем. Так, бабка-павітуха пасля купання нованароджанага дзіцяці, трымаючы яго на руках, разам з кумам тры разы абыходзіла вакол стала, на якім ляжаў хлеб.

Немалаважна тут падкрэсліць тое, што рытуальны абыход вакол стала звычайна ажыццяўляўся па ходу сонца, што яшчэ раз дэманструе сувязь стала з пабудовай свету, яго сімвалічную ролю цэнтра светабудовы – зямлі, вакол якой, па геацэнтрычных уяўленнях нашых продкаў, абарочваецца сонца.

Пра тое, што ад стала як свяшчэннага прадмета ідуць сувязі з небам, гаворыць звычай у час памінальнай вячэры на Дзяды адкладваць на стол частку рытуальнай стравы "кануна" для душаў памёршых продкаў, якія, як думалі, жывуць на небе. Таксама нябожчыка, які, як лічылася, знаходзіцца на пачатку шляху на неба, да бога, звычайна клалі на стол у чырвоным куце, у чым праяўлялася павага да памёршага і прызнанне ўзвышанасці самога акта смерці. У гэтым ізноў выяўлялася сувязь стала з небам.

Такім чынам, як мы ўстанавілі, у беларускай народнай хаце можна вылучыць некалькі сакральных цэнтраў. Першы, "паганскі" – печ, другі, хрысціянскі – чырвоны кут і, нарэшце, з'яўляецца яшчэ адзін сакральны цэнтр – стол, які гэткім робіцца спачатку за кошт свайго знаходжання ў покуці, а потым усё больш набывае самастойнае значэнне, пачынаючы выконваць ролю цэнтра сімвалічнай мадэлі сусвету, якой нашым продкам бачылася хата, ролю Зямлі, вакол якой рухаецца ўсё ў неабдымным космасе. Названую ж сімвалічную мадэль сусвету ў хаце пачынае выконваць увесь комплекс рэчаў, якія напаўняюць народнае жытло, прычым усе гэтыя рэчы неяк семантычна звязваюцца са сталом як сімвалічным цэнтрам гэтай мадэлі.

Так, са сталом як прадметам, важным у сімволіцы жыцця хаты, быў цесна звязан абрус. Звычайна стол у хаце стаяў непакрыты, але ва ўрачыстыя, рытуальна адзначаныя моманты ён накрываўся абрусам. Таму можна лічыць, што ў старажытнай беларускай хаце абрус меў больш сімвалічную, абрадавую функцыю, чым утылітарную. На абрус пераходзіла значная частка сакральнага сэнсу стала. Трэба сказаць, што ў некаторых выпадках, напрыклад, у час памінак на могілках, калі на яго, разасланага на зямлі, ставілі памінальныя стравы, – абрус сімвалічна замяняў стол. Стол жа, у сваю чаргу, у хаце пачынаў найбольш актыўна рытуальна дзейнічаць менавіта тады, калі пакрываўся абрусам у час нейкіх свят ці абрадавых дзеянняў.

У абрадавым сімвалічным плане стол і абрус стваралі цеснае адзінства, былі неад'емныя адзін ад аднаго. Заўважым, што на непакрытай паверхні стала не рабіліся ніякія сімвалічныя выявы, што, увогуле, дзіўна для прадмета з такой вялікай сімвалічнай функцыяй. Але гэтая супярэчнасць здымаецца тым, што сімвалічныя выявы рабіліся менавіта на абрусе. Вышываны ці тканы рытуальны арнамент, што наносіўся на абрус, адпавядаў абрадавай, сімвалічнай ролі, якую адыгрываў стол у жытле. Тут можна было сустрэць арнамент з ромбаў – сімвала зямлі, урадлівай глебы, раслінны арнамент, што меў магічную засцерагальную функцыю і наносіўся на рытуальна адказныя аб'екты рэчавага свету.

Блізкім па функцыянальна-рытуальнай ролі да абруса быў ручнік. У хаце яго часам клалі на стол замест абруса, на могілках на Дзяды ён таксама часам выкарыстоўваўся ў ролі абруса, калі на яго ставілі памінальныя стравы. Як і абрус, ручнік у жытле функцыянальна і рытуальна быў звязан са сталом. Ручніком выціралі рукі, калі іх мылі перад тым, як сесці за стол. Ручнікі-"набожнікі", якімі ўпрыгожваліся абразы, з'яўляліся прыналежнасцю чырвонага кута, дзе стаяў стол. Пра рытуальную сувязь ручніка са сталом як сімвалам зямлі ў мадэлі сусвету, якую ўяўляў сабою рэчавы свет хаты, гаворыць тое, што ва ўзорачны беларускіх ручнікоў пераважаў ромб, які, як мы ведаем, у старажытнай славянскай сімволіцы ўвасабляў зямлю, урадлівую глебу. Пра гэта ж гаворыць і ўстойлівае рытуальнае выкарыстанне ручніка разам з хлебам. Звычайна на ручніку прыносілі хлеб-соль, хлеб на ручніку клаўся на стол і г.д. Хлеб як сімвал урадлівасці, багацця, выступаючы "у тандэме" з ручніком, указваў на тое, што і ручнік мае блізкую сімволіку, звязаную з багаццем, шчасцем, урадлівай глебай.

Але трэба сказаць, што ручнік у народным жыцці адыгрываў вельмі рознастайныя сімвалічныя ролі. Ён ужываўся і ў час хрэсьбін як сімвал будучага шчасця немаўляткі, і ў час

вяселля пры пажаданні дабрабыту жаніху і нявесце, і ў час пахавання як сімвалічная сувязь свету мёртвых і свету жывых. Тут мы не будзем падрабязна спыняцца на ўсіх акалічнасцях сімвалічна-абрадавай ролі ручніка, завострым толькі ўвагу яшчэ на адной агульнай для ручніка і абруса сімвалічнай ролі, якая з'яўляецца важнай для разумення асаблівасцяў адлюстравання ў сімволіцы рэчавага свету ўяўленняў беларускага народа аб пабудове сусвету.

У некаторых раёнах Беларусі пры пахаванні нябожчыка адзін канец ручніка, які быў спецыяльна прызначаны для гэтага рытуалу, прыбівалі да века труны, а другі замацоўвалі на магільным крыжы, што павінна было сімвалізаваць дарогу нябожчыка з гэтага свету ў свет іншы. Словам "дарога" называлі таксама ў Старадарожскім раёне і ручнік, што прыбіваўся ўздоўж сцяны, каля якой на лаве ляжаў нябожчык [4, с.81]. Сімвалічную ролю ручніка як дарогі можна прасачыць і ў час вясельнага абраду, бо, як адзначае В.Фадзеева, "і смерць, і шлюб успрымаліся як пачатак новага этапа, новага становішча ў жыцці, як дарога ў нязведанае і пераход у іншыя абставіны..." [4, с.93]. Гэта пацвярджае звычай, калі нявесце, якую вялі на пасад, прывязвалі да рукі доўгі ручнік, які павінен быў замятаць сцежку, сімвалізуючы светлы шлях у жыцці маладой.

Але і абрус у старажытнай славянскай сімволіцы таксама з'яўляўся вобразам дарогі. Успомнім рускую прымаўку: "Скатертью дорога!" Пра гэтую сімвалічную ролю абруса гаворыць і беларускі даследчык старажытнай сімволікі І.Марозаў, які адзначае, што, праводзячы каго-небудзь у дарогу, звычайна махалі хусткай, саматканым ласкутом, які з'яўляўся часткай сімвалічнага абруса, які ўвасабляў дарогу [5, с.286].

Такім чынам, у сімвалічнай мадэлі сусвету, якую ўяўляў рэчавы свет жытла, ручнік і абрус увасаблялі дарогу, якая звязвала зямлю з небам, з сонцам, з боскім светам. У хаце гэтая сімвалічная дарога ішла ад стала як зямліцэнтра мадэлі сусвету праз абрус, якім пакрываўся стол ва ўрачыстыя моманты, і ручнікі, якія ўпрыгожвалі абразы, да боскай, нябеснай сферы, якую сімвалізавала покуць, а праз ручнікі, якімі часам у рытуальных мэтах аздаблялі вокны, непасрэдна за межы жытла – да сонца, да святла.

Акрамя стала ў хаце была і іншая мэбля, напрыклад, лаўкі. Ці мелі яны якое-небудзь сімвалічнае значэнне? Аднак перш чым адказаць на гэтае пытанне, трэба сказаць пра тое, што ў далёкім мінулым, па ўяўленнях сялян, свет не быў адзіны, у ім існавалі, змагаліся два пачаткі – светлае і цёмнае, пачатак дабра і зла. А паколькі хата ёсць паменшаная мадэль светабудовы, то і ў ёй прысутнічалі дзве сілы, два жыццёвыя пачаткі.

Цяпер канкрэтна пра лаўкі. Справа ў тым, што калі стол як сімвал зямлі ўвасабляў нешта высокае, дабро і дабрабыт земляроба, то ўсё, што размяшчалася ніжэй паверхні стальніцы, не мела станоўчага сімвалічнага значэння. Тут размяшчаўся "падземны свет", месца, дзе маглі дзейнічаць нячыстыя духі. Безумоўна ж, рэчы, якія знаходзіліся ў "свеце нячысцікаў", не маглі несці станоўчага сімвалічнага значэння ва ўсведамленні чалавека мінулага. Да іх адносіны былі зусім іншыя, чым да стала. Напрыклад, не належала класці хлеб на лаўку. Не магла паверхня лаваў, якая з'яўлялася якраз мяжой, пад якой знаходзілася месца жыхарства нячыстых духаў, быць месцам знаходжання хлеба, які ва ўяўленні народа быў амаль свяшчэнным. У важныя ўрачыстыя моманты жыцця чалавека блізкасць паверхняў сядзенняў да сферы дзейнасці нячысцікаў магла адмоўна паўплываць на ход падзеі. Таму ў час вяселля лаве, на якой садзіліся жаніх і нявеста, удзялялася асобая ўвага ў тым плане, каб абараніць маладых ад якой-небудзь шкоды і ў той жа час павысіць сімвалічны статус лавы. З гэтай мэтай яна ў час розных вясельных абрадаў: сватання, перапросін (каравайнага вечару), запоін (заручын) пакрывалася ручніком, які, як вядома, у народным усведамленні меў вялікі станоўчы сімвалічны сэнс. Такім спосабам паверхня сядзення як бы адмяжоўвалася ад тых магчымых адмоўных уплываў, якія маглі ісці з боку ніжняга свету хаты, ад нячысцікаў. У тым жа выпадку, калі нявеста ці жаніх не захавалі да вяселля цнатлівасці, іх саджалі на непакрытую лаву ці табурэтку, г.з. на сядзенне, неасвечанае добрай сімволікай, адкрытае цёмным сілам. Саджанне на голую лаву ці табурэтку лічылася ганебным.

Пра тое, што ў ніжняй частцы хатняй прасторы жывуць сілы, варожыя да працаўнікахлебароба, гаворыць і абрад на Каляды пасля рытуальнай вячэры звязваць вяроўкай ножкі стала. Сэнс абраду быў у тым, што азначанае дзеянне паўплывае на жывёлу, каб яна не пераскоквала праз платы, на тое, каб не ўцякалі раі пчол. Зразумела, што магічнае звязванне ножак стала азначала імкненне звязаць цёмныя сілы, паралізаваць іх магчымае шкоднае для гаспадаркі ўздзеянне.

Да гэтага часу мы гаварылі пра сімволіку беларускага сялянскага жытла і яго абсталявання. Але сімволікай характарызаваліся таксама народнае хатняе начынне і посуд. У старажытнай славянскай сімволіцы посуд у першую чаргу звязваўся з сонцам. Гэтая сувязь, па сцвярджэнню акадэміка Б.Рыбакова, ідзе ўжо ад круглай формы, якую звычайна маюць пасудзіны. "Круглая форма посуду, – піша даследчык, – як бы сама ў сабе заключае ідэю сонца... Акругласць самога начыння, круглыя вобручы, клёпкі, якія іх замацоўвалі, – усё гэта, напэўна, замяняла сонечныя знакі" [7, с.501].

Несумненную сувязь з сонечнай сімволікай можна прасачыць, напрыклад, у рытуальнай ролі, якую адыгрывала ў старажытнай беларускай хаце такая драўляная пасудзіна, як хлебная дзяжа. Яе як ёмістасць, дзе гатуецца хлеб – самы важны для чалавека прадукт, – вельмі паважалі ў сялянскім асяроддзі, таму часта ставілі ў ганаровае месца ў хаце – на лаву ў чырвоным куце, які, як мы ведаем, увасабляў у жытле сферу сонца, неба. Такім чынам, дзяжа, знаходзячыся на покуці, прымала на сябе пэўныя рысы салярнай сімволікі, рысы сонца як элемента сімвалічнай мадэлі сусвету, якую ўяўляла рэчавае абсталяванне хаты. Характэрна, што калі перад вяселлем маладая з дружкай хадзілі па дамах, запрашаючы на шлюбнае свята, яны, уваходзячы ў хату, кланяліся спачатку покуці і дзяжы як увасабленню сонца, а потым ужо ўсім прысутным. Сімвалічная роля дзяжы як сонца адлюстроўвалася і ў беларускіх народных загадках. Напрыклад: "За лясамі, за гарамі, за вялікімі марамі залатая дзяжа кісне" [8, с.73].

Са сталовага посуду найбольш каштоўным аб'ектам у сімвалічным касмалагічным плане з'яўляліся сальніцы. Асабліва тут трэба адзначыць сальніцы ў выглядзе качак. Форма такіх сальніц не выпадковая. (Дарэчы, сальніцы гэтай формы здаўна рабілі не толькі ў Беларусі, але і на Поўначы Расіі, у Валагодскай і Архангельскай губернях). Старажытныя славяне абагаўлялі прыроду, у тым ліку і свет жывёл, таму выкарыстоўвалі выявы звяроў і птушак у якасці абярэгаў, г.з. талісманаў, якія здольныя, як лічылася, абараніць чалавека ад злых сіл. Да такога разраду талісманаў і ў нашых продкаў належалі выявы птушак. Адсюль і сальніцы ў выглядзе качак. Але нас у дадзеным выпадку цікавіць і іншы сэнс гэтай рэчы. Справа ў тым, што ў старажытнай славянскай сімволіцы качка-гусь, таксама як і конь, увасаблялі істоту, якая садзейнічае руху дзённага свяціла, што калі конь вядзе па небу сонца ўдзень, то качка вядзе яго ўначы па падземнаму мору. Такім чынам, сальніца ў выглядзе выявы качкі як сімвал сонца ўключалася ў сімвалічную касмалагічную мадэль, якую ўяўлялі хата і яе рэчавы свет, што ствараў вакол сябе старажытны беларус.

Сімволікай валодаў і драўляны коўшык. Ён мог таксама рабіцца ў выглядзе выявы птушкі альбо каня. Пры гэтым ролю тулава птушкі ці жывёліны выконвала сама ёмістасць, яе ж ручка выяўляла галаву з шыяй, выгнутай, як у каня альбо ў качкі ці гуся. Такім чынам, праз гэтыя вобразы і драўляны коўшык звязваўся з сонечнай сімволікай. Гэтую сувязь падмацоўваюць і розныя салярныя знакі ў выглядзе сонечных разетак, якія нярэдка беларускія народныя майстры выразалі на гэтых аб'ектах.

Касмалагічныя ўяўленні нашых продкаў адлюстроўвала і сімволіка некаторых хатніх прылад працы, што меліся ў гаспадарцы беларускіх сялян. Вельмі адметнай сімволікай валодала, напрыклад, прасніца, касмалагічная сімволіка якой у асноўным праяўлялася ў разным дэкоры, што наносіўся на паверхню рэчы. Праўда, трэба адзначыць, што дэкаратыўнае аздабленне прасніц у Беларусі было не настолькі пашырана, як, напрыклад, на поўначы Расіі ці ў карпацкім рэгіёне Украіны. Але ў некаторых раёнах Беларусі, у асноўным у Заходнім Палессі, у Камянецкім раёне, яно было дастаткова развіта. Як адзначае Б.Рыбакоў, "сімвалічная арнаментыка прасніц, нягледзячы на асобныя мясцовыя адрозненні, вельмі аднародная ва ўсіх славянскіх народаў, што дазваляе вывесці яе ад вельмі аддаленай старажытнасці праславянскіх народаў" [7, с.510]. Даследчык піша: "Вынікі аналізу вялікай колькасці прасніц прывялі да наступных вывадаў: разьбой і размалёўкай перададзена старажытная карціна свету, якая бярэ пачатак у бронзавым веку. Ніжні свет, свет падземна-прыродны, свет начнога сонца перададзен вобразам яшчара і сонца, якое знаходзіцца пад зямлёй. У сярэдзіне ці ніжняй частцы лопасткі размяшчалася выява ўзаранай нівы (квадрацікі ці ромбы, звычайна заштрыхаваныя). Ніжэй "зямлі" на бакавых ніжніх выступах прасніцы... амаль абавязкова змяшчалася рэльефная выява сонца, якое ўзыходзіць і заходзіць. Шлях сонца па небасхіле абазначаўся выступамі на верхнім дугападобным краі прасніцы. Уся яе цэнтральная плоскасць, да якой датыкалася кудзеля, была адведзена тэме сонца як сімвалу неба і чароўнай па сваёй гарманічнасці выяве "белага свету", які грае дзесяткамі граняў сваёй складанай кампазіцыі".

Мы прывялі апісанне арнаментыкі старажытных славянскіх прасніц, зробленае Б. Рыбаковым, таму што беларускія камянецкія прасніцы мелі такую ж самую структуру выяў на сваёй паверхні. З гэтага можна зрабіць выснову, што галоўны сэнс аздаблення беларускіх прасніц таксама выяўляў старажытныя народныя ўяўленні аб пабудове сусвету. Да беларускіх прасніц можна аднесці і выснову расійскай даследчыцы Н.Шайхітдзінавай аб тым, што ў самой структуры традыцыйнай славянскай прасніцы адбілася ўяўленне старажытнага чалавека аб светабудове. Яна падобная да “сусветнага дрэва”: лопасці – гэта крона ці нябесная сфера, ствол – зямны свет, донца – падземны” [9, с.12].

Трэба сказаць, што навукоўцы бачаць адбітак мадэлі светабудовы і ў структуры канструкцыі кроснаў. Так, ужо згаданая намі Н. Шайхітдзінава піша: “... архітэктоніка стана як быццам першапачаткова ўвасабляе ўяўленне аб светабудове... Ніжні свет, падземны – ніжэй падножак. Сярэдні свет, зямны – сама станіна. Верхні свет, нябесны – набілкі і бёрды, ніты і прастора вышэй краништэйнаў стана”.

Гэтую сувязь з уяўленнямі чалавека аб пабудове сусвету, аб руху Сонца і Зямлі, які абумоўлівае заканамернасці прыроды, пацвярджае і сімволіка ўстаноўленай у беларусаў са старажытных часоў перыядычнасці самаго працэсу ткацтва кроснаў. Лічылася, што на працягу года беларуская жанчына павінна саткаць чацвёра кроснаў: адны – да Міхала, другія – у Піліпаўку, трэція – у Мясаед, а чацвёртыя – у вялікі пост. Тым самым адзначаліся чатыры пары года, абумоўленыя заканамернасцямі існавання сусвету: Міхал – гэта позняя восень, Піліпаўка – зіма, Мясаед – вясна, вялікі пост азначаў пачатак лета (непасрэдна летам не ткалі, бо былі заняты палявымі работамі).

Сімволіка, звязаная з уяўленнем аб светабудове, прысутнічае і ў беларускім народным адзенні. Так, глыбокі сімвалічны сэнс мела адзежа, якую апраналі дзяўчаты на Купалле. На галаву, акрамя вянкоў, надзявалі хусткі з тканіны абавязкова блакітнага колеру, што павінна было сімвалізаваць неба, на ногі ж надзявалі панчохі і падвязкі, упрыгожаныя раслінным арнаментам, што ўвасабляла зямлю [7, с.128]. Такім чынам, у строі дзяўчыны адбівалася сутнасць Купалля як летняга свята, свята яднання нябесных і зямных стыхій. Можна ўбачыць таксама сувязь штодзённага касцюма маладой жанчыны з Дрэвам жыцця, уяўленні аб якім у пэўнай ступені гэтак жа адбівалі народны погляд на пабудову свету. Падол кашулі, ніз фартуха, андарак аздаблялі звычайна вышыўкай у выглядзе сімвалаў зямлі, пладаноснай глебы. Дэкарыроўка ж верхняй часткі строю адлюстроўвала сімволіку неба, сонца [10, с.72].

З космасам, з дзённым нябесным свяцілам была звязана і сімволіка дзявочых галаўных убораў, асабліва вянка. Гэты ўбор у даўніну з’яўляўся важным сімвалічным элементам сонечнага культу, які ўваходзіў у народную земляробчую абраднасць. Абумоўлівалася гэта хутчэй за ўсё формай вянка, якая нагадвала кола – прызнаны салярны сімвал. Аб гэтым сведчыць і тое, што, напрыклад, у час абраду “выязду ў поле Ярылы”, што праводзіўся на Ярылавіцу (Красную горку), хлопцу, які ў абрадзе іграў ролю бога сонца, таксама надзявалі на галаву вянок. Пра салярную сімволіку вянка гаворыць і шырокае абрадавае ўжыванне вянкоў у час Купалля, свята, прысвечанага летняму сонцастаянню.

Такім чынам, мы бачым, што сімволіка рэчавага свету беларускага народа шмат у чым была звязана з касмаганічнымі і касмалагічнымі уяўленнямі, якія існавалі ў старажытнасці ў нашых продкаў. Пачынаючы з пабудовы жылля, яго ўнутранага абсталявання і заканчваючы асобнай рэччу хатняга ўжытку – усё стваралася селянінам-хлебаробам з думкаю пра тое, што яго жыццё – часцінка светабудовы і дачыненне да гармоніі сусвету, дарує яму дабрабыт і шчасце. Чэрпаючы сімволіку аб’ектаў свайго рэчавага свету з уяўленняў аб пабудове космасу, аб заканамернасцях сусвету, чалавек як бы набліжаў яго да сябе і гэтым набліжэннем станоўчых элементаў макракосму да свайго мікракосму абараняўся ад уздзеяння адмоўных сіл, якія, па яго меракаванню, клубіліся вакол яго жылля. У гэтым была мудрасць народнай душы, мудрасць нашых продкаў, якія жылі ў цяжкіх умовах не вельмі добразычлівага да іх свету прыроды, што нёс ім розныя выпрабаванні ў час засухі ці вялікіх дажджоў, навальніц ці ўраганаў. У гэтай нялёгкай барацьбе з навакольным светам беларускі селянін змог выстаяць таму, што жыў не толькі ў свеце сваіх дробных побытавых праблем, а ўзнімаўся ў сваіх думках да разумення і пераасэнсавання ў сваім розуме глабальных праблем пабудовы сусвету, вялікага космасу з яго бязмежнымі прасторамі і яго вечным існаваннем у гэтым жыцці.

Труды Минского института управления. 2008. №2

## ЛІТАРАТУРА

1. Рыбаков, Б. Макрокосм и микрокосм народного жилища / Б. Рыбаков // Декоративное искусство СССР. – 1975. – № 1.
2. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск, 1998.
3. Федароўскі, М. Люд беларускі: Вяселле / М. Федароўскі. – Мінск, 1991.
4. Фадзеева, В. Беларускі ручнік / В. Фадзеева. – Мінск, 1994.
5. Морозов, И.В. Таинственным путем Гермеса / И.В. Морозов. – Мінск, 1994.
6. Купала, Я. Збор твораў: у 6 т. / Я. Купала. – Мінск, 1954. – Т.5.
7. Рыбаков, Б.А. Язычество Древней Руси / Б.А. Рыбаков. – М., 1988.
8. Конан, У. Славянская міфалогія ў кантэксце беларускай культуры / У. Конан // Мастацтва. – 1997. – №12.
9. Шайхитдинова, Н. Живую одежду я тку божеству / Н. Шайхитдинова // Декоративное искусство СССР. – 1990. – № 9.
10. Каранеўская, І. Знакі прысутнасці вечнага / І. Каранеўская // Мастацтва. – 1998. – №2. – С.72.



## РЕЗЮМЕ

Символика предметного мира белорусского народа во многом была связана с космогоническими и космологическими представлениями, которые существовали у наших предков. Начиная с построения жилища, его внутреннего оборудования и кончая отдельной вещью домашнего обихода – все создавалось крестьянином-хлеборобом с мыслью о том, что его жизнь – частица мироздания, а приближение его к гармонии мира дарует ему благополучие и счастье. Черпая символику объектов своего предметного мира из представлений о строении космоса, о закономерностях вселенной, человек как бы приближал ее к себе и этим приближением положительных элементов макрокосма к своему микрокосму защищался от воздействия отрицательных сил, которые, по его представлению, клубились вокруг его жилища. В этом была мудрость народной души, мудрость наших предков, которые жили в тяжелых условиях не очень доброжелательного к ним мира природы.


* Статья поступила в редакцию 23.04.2008 г.

# ПРЕДМЕТ, СОЦИАЛЬНАЯ СПЕЦИФИКА ТЕАТРАЛЬНОГО ИСКУССТВА И ЕГО КОМПОНЕНТЫ

***Г.В. Юдчиц**, социолог, г. Минск*

Для рассмотрения предмета театрального искусства надо иметь четкое представление о предмете в целом. Большинство специалистов сегодня согласно с тем, что предметом искусства является человек в его общественных связях и отношениях к действительности. Во всяком случае данной формулой охватывается всё многообразие искусства. В этом контексте существенно и то, чем искусство не интересуется, что оно не отражает, чему, если